Салаўёў М.

# У БАЛТЫЙСКІМ НЕБЕ

**Жучкоў Ціхан Свірыдавіч нарадзіўся 4 ліпеня 1922 года ў вёсцы Бахацец Чавускага раёна.**

**Член КПСС з 1945 года.**

**Герой Савецкага Саюза.**

**У 1941 годзе закончыў Магілёўскі аэраклуб. Затым паступіў у ваенна-марское авіяцыйнае вучылішча, якое закончыў у 1942 годзе і ў верасні трапіў на фронт. Лётчык-знішчальнік Ваенна-Паветраных Сіл Балтыйскага флоту. Адзначыўся пры прарыве блакады Ленінграда і вызваленні Ленінградскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

**У 1945–1960 гады Жучкоў Ц. С. – лётчык-выпрабавальнік. З 1960 года – у запасе. Жыве ў Маскве.**

У адзін з вераснёскіх дзён 1942 года лётчык лейтэнант Ціхан Жучкоў прыбыў у 3-і гвардзейскі знішчальны авіяцыйны полк. Сокалы яго праславіліся ў баях за Ленінград, змагаліся мужна. Палком камандаваў Герой Савецкага Саюза Пётр Васільевіч Кандрацьеў.

– Наш камандзір – твой зямляк, – расказваў Жучкову яго вядучы старшы лейтэнант Дзмітрый Татарэнка. – Родам з Віцебска. І ўся баявая дзейнасць нашага камандзіра звязана з палком. Ваяваў з белафінамі. І за мужнасць. праяўленую ў баях, яшчэ ў 1940 годзе яму прысвоілі званне Героя.

Так і пачалася баявая служба Ціхана Жучкова. Але не адразу Ціхана пусцілі ў бой. Тры месяцы знаходзіўся на прыфрантавым аэрадроме. Настойліва вывучаў новую тэхніку, майстэрства вопытных таварышаў.

Наступіў снежань. І вось Жучкову дазволілі першы баявы вылет. А потым даводзілася лятаць штодзень. Мацнела майстэрства маладога авіятара, гартавалася воля. расло ўменне. У баі смелы, разважлівы.

23 студзекя 1943 года самалёт лейтэнанта Жучкова ўзвіўся ў неба. Ішоў у саставе шасцёркі знішчальнікаў. Заданне – прыкрыць наземныя войскі, якія вялі цяжкія баі. Ва ўказаным раёне савецкія сокалы з’явіліся ў назначаны час. Шасцёрка зрабіла некалькі заходаў. І вось вядучы перадаў:

– Прыняць баявы парадак. Справа бачу самалёты праціўніка. Нашы знішчальнікі перастроіліся і ўслед за вядучым узвіліся ўгору, каб з вышыні атакаваць варожыя машыны. Цяпер фашысцкія самалёты апынуліся ніжэй. Жучкоў налічыў дваццаць. Пад камбінезон закрадваўся халадок. У галаве мільганула: "Нялёгка нам будзе".

Але раздумваць не было калі. лп калі. Фрыцы прыбліжаліся, прыбліжаўся паветраны бой. Вядучы кінуў сваю машыну ўніз,

насустрач ворагу. Следам за вядучым, як прывязаны, нёсся і самалёт Ціхана Жучкова. Шэсць савецкіх знішчальнікаў нанеслі імгненны ўдар па нямецкіх сцярвятніках. Чатыры "юнкерсы" густа задымілі, пачалі падаць, і за імі цягнуліся чорныя шлейфы дыму. Астатнія шаснаццаць, не прыняўшы бою, зніклі ў хмарах.

...Вясна сорак чацвёртага года была ў самым разгары. Ярка свяціла сонца, і блакітнае неба вабіла сокалаў у свае прасторы. А ў лётчыкаў-гвардзейцаў былі гарачыя дзянькі. Чуць паспя валі прызямліцца на аэрадроме, крыху адпачыць, як зноў разносіўся загад:

– Старшаму лейтэнанту Жучкову – вылет!

Мінуты ўходзілі на ўзлёт, і знішчальнік імкліва ўносіўся ў блакітную далячынь неба.

11 красавіка 1944 года старшы лейтэнант Ціхан Жучкоў вылецеў у групе. Ішлі на невялікай вышыні. На падыходзе да цэлі два варожыя знішчальнікі раптам вываліліся з-за воблакаў, атакавалі самалёт вядучага групы Папова. Немінуемая гібель пагражала капітану, не прыдзі яму на дапамогу Ціхан Жуч коў. Ён рэзка кінуу сваю машшу уперад і на нейкі міг апярэдзіў ворага. Чарга Жучкова прагрымела раней і прашыла нямецкі знішчальнік. Той яшчэ па інерцыі некалькі пранёсся ўперад і раптам рэзка пайшоў уніз: агонь ахапіў гітлераўскага сцярвятніка. Другі "мессершміт" даў дзёру.

**Над Балтыйскім морам** грымелі баі. Савецкія штурмавікі і бамбардзіроўшчыкі наносілі ўдары па ворагу. Палалі ў моры нямецкія караблі, ад выбухаў бомб уздрыгваў бераг – савецкіякія лётчыкі штурмавалі, бамбілі, знішчалі варожыя аб'екты, рубяжы абароны, жывую сілу і баявую тэхніку фашыстаў. Ад штурмавікоў і бамбардзіроўшчыкаў не адставалі і знішчальнікі. Яны наносілі штурмавыя ўдары, дапамагалі наземным войскам крышыць абарону праціўніка.

Біў ворага і Ціхан Жучкоў. Да вясны 1945 года ён зрабіў ужо 250 баявых вылетаў, правёў 37 паветраных баёў, асабіста збіў 10 і ў групе – 11 варожых самалётаў, 70 разоў вылятаў на разведку і аэрафотаздымкі караблёў, ваенна-марскіх баз і аэрадромаў праціўніка. Неаднаразова старшаму лейтэнанту даводзілася то ў групе, то ў адзіночку вылятаць на вольнае "марское паляванне". Так было і ў той дзень. Бушавала непагодлівае мора. Па небу плылі чорныя хмары. Бачнасць – самая мінімальная.

Жучкову і яго вядомаму лейтэнанту Харланаву камандзір эскадрыллі маёр Хлыстоў дазволіў вылецець на "свабоднае паляванне". Знішчальнікі ўзмылі ў паветра і ўзялі курс у адкрытае мора. З зямлі ўважліва сачылі за палётам.

– Якая бачнасць? – спытаў камандзір эркадрыллі.

– Шэсцьсот метраў, не больш, – адказаў Жучкоў.

– Узмацніць назіранне!

Праходзілі мінуты. Праз паўгадзіны палёту Жучкоў паведаміў:

– Злева бачу транспарт!

– Наносьце ўдар! – загадалі з зямлі.

Жучкоў дакладна ўсё разлічыў і выпусціў рэактыўныя снарады. Яны трапілі ў цэль, і варожы транспарт загарэўся. Лётчыкі пайшлі далей і неўзабаве аказаліся над варожай ваенна-марской базай, дзе разгружаўся транспарт з войскамі і баявой тэхнікай. На брыючым палёце знішчальнікі Жучкова і Харланава пранесліся над мачтамі карабля. Выбухі паследавалі адзін за другім. Узнік пажар, і полымя ахапіла судна. Ворагі забегалі, замітусіліся як у ліхаманцы. А самалёты зноў заходзілі на цэль. Варожыя зеніткі сустрэлі знішчальнікаў шчыльным агнём. Адзін са снарадаў разарваўся паблізу знішчальніка старшага лейтэнанта. Асколкі пашкодзілі фюзеляж і хваставую частку. Машына пачала траціць упраўленне, і лётчык павёў барацьбу за выратаванне баявой машыны. Удалося збіць полымя. Цяпер перад Жучковым устала другая цяжкая задача – як пасадзіць пашкоджаны самалёт. Калі Ціхан Жучкоў апынуўся ў зоне свайго аэрадрома, камандзір палка, які выйшаў сустракаць вяртаючыхся з баявога вылету лётчыкаў, адразу ўсё зразумеў і загадаў:

– Жучкоў, пасадку забараняю. Пакіньце машыну і прыгайце з парашутам.

Жучкоў нічога не адказаў падпалкоўніку Кандрацьеву: ён цалкам быў заняты выратаваннем самалёта. І перамог. Машыну давялося пасадзіць.

Адбылося гэта ў апошнія дні лютага сорак пятага года. А 6 сакавіка 1945 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў старшаму лейтэнанту Жучкову Ціхану Свірыдавічу званне Героя Савецкага Саюза. Дзень Перамогі Герой сустрэў з многімі баявымі ўзнагародамі на грудзях і хутка стаў лётчыкам-выпрабавальнікам. Гэтай справе аддаў пятнаццаць гадоў. Актыўна ўдзельнічў у ваенна-патрыятычным выхаванні савецкай моладзі.

**Салаўёў, М. У Балтыйскім небе / М. Салаўёў // Іскра (Чавусы). — 1975. — 25 студзеня. — С. 2.**